Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
____________ Д.В. Герасімёнак
«18» ______02______ 2026 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
____________ Ю.М. Галкоўская
«18» ______02______ 2026 г.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА ЭКСКУРСІЙНАЙ РАБОТЫ

для спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Складальнік: Лупашка І.Г., дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат культуралогіі, дацэнт

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый

«17» лютага 2026 г., пратакол № 6

Рэцэнзенты:

Навукова-метадычны савет дзяржаўнай установы “Музей гісторыі горада Мінска”;

*С. А. Пацыенка*, дацэнт кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці, кандыдат культуралогіі

Разгледжана і абмеркавана на пасяджэнні кафедры гісторыка-культурнай спадчыны (пратакол ад 30.01.2026 № 6)

ЗМЕСТ


1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 7
2.1 План-канспект лекцый 7
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ 12
3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў 12
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ 17
4.1 Заданні да самастойнай работы студэнтаў 17
4.2 Пытанні да экзамена 17
4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вуэбнай дзейнасці студэнтаў 19
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ 22
5.1 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны 22
5.2 Асноўная літаратура 23
5.3 Дадатковая літаратура 23

# 1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Тэорыя і практыка экскурсійнай работы» для студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0322-03 "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны" распрацаваны на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі першай ступені АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Рэгістрацыйны нумар 6-05-03-29/23 вуч.ад 15.02.2023.

У сучасных умовах значная ўвага надаецца развіццю музейнай справы і культурна-пазнавальнага турызму. Экскурсія з'яўляецца эфектыўным камунікатыўным і інфармацыйным сродкам, дзякуючы чаму з'яўляецца адным з асноўных складнікаў культурна-адукацыйнай дзейнасці музея і шырока выкарыстоўваецца ў сферы турысцкай індустрыі. Запатрабаванасць у кваліфікаваных спецыялістах у сферы экскурсійных паслуг пацвярджае, што тэорыі і практыцы экскурсійнай справы неабходна вучыцца прафесійна. Такія абставіны робяць дысцыпліну «Тэорыя і практыка экскурсійнай работы» надзвычай актуальнай і важнай у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музейнай справы і турызму.

Мэтай вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца азнаямленне з тэорыяй і практыкай экскурсійнай работы, фарміраванне ведаў і практычных навыкаў, неабходных для распрацоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій.

У адпаведнасці з мэтай вызначаны наступныя задачы:

– азнаямленне студэнтаў з асноўнымі палажэннямі тэорыі экскурсійнай работы;
– фарміраванне дакладнага ўяўлення аб методыцы арганізацыі і правядзення экскурсіі;
– фарміраванне прафесійных навыкаў экскурсавода;
– вывучэнне айчыннай практыкі падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне экскурсазнаўства;
– азнаямленне з асноўнымі экскурсійна-турысцкімі маршрутамі Беларусі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– тэарэтычныя аспекты экскурсійнай работы;
– метадычныя аспекты экскурсійнай работы;
– асновы экскурсійнага майстэрства;
– змест экскурсійнай работы музея і турыстычных установ, якія займаюцца экскурсійнай дзейнасцю.

Студэнты павінны *ўмець:*

– выкарыстоўваць асноўныя паняцці, тэрміны, фактычны матэрыял і атрыманыя навыкі ў музейнай і пазамузейнай дзейнасці;

– вызначаць эфектыўную методыку правядзення экскурсіі з улікам дыферэнцыраванага падыходу да экскурсійнага абслугоўвання;

– распрацоўваць экскурсіі разнастайнай тэматыкі (падрыхтаваць тэкст экскурсіі, распрацаваць тэхналагічную карту экскурсіі);

– аналізаваць праслуханыя экскурсіі.

Студэнты павінны *валодаць навыкамі:*

– распрацоўкі экскурсій і адпаведных дакументаў;
– камунікацыі з наведвальнікамі музея;
– стварэння інфармацыйных прадуктаў розных відаў па тэме курса.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя і практыка экскурсійнай работы» прадугледжана фарміраванне наступнай кампетэнцыі:

– выкарыстоўваць сучасныя веды аб культуры і тэндэнцыях яе развіцця ў музейнай, турыстычнай і менеджэрскай дзейнасці, ахове культурнай спадчыны, навыкі педагагічнага і аратарскага майстэрства ў яе інтэрпрэтацыі.

Вучэбна-метадычны комплекс і вучэбная праграма вучэбнай дысцыпліны «Тэорыя і практыка экскурсійнай работы» распрацавана з улікам пастаўленых задач, узгоднена з праграмамі іншых вучэбных дысцыплін: «Гісторыя музейнай справы», «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны», «Тэорыя і гісторыя культуры», «Тэорыя турызму», «Турыстычны патэнцыял Беларусі», «Тэорыя і методыка музейнай справы» і інш.

Актывізацыі самастойнай работы студэнтаў у накірунку пошуку і выкарыстання ведаў, атрымання самастойнага вопыта вырашэння задач садзейнічаюць такія дзейсныя педагагічныя методыкі і тэхналогіі, як:

– гісторыка-тэматычны падыход;
– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.);
– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-

метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы, метад малых груп.

Усяго па вучэбнай дысцыпліне вучэбным планам прадугледжана 120 гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 40 гадзін, семінарскія заняткі – 20 гадзін. Рэкамендаваная форма бягучай атэстацыі –вуснае апытанне. Рэкамендаваная форма прамежкавай атэстацыі – экзамен.

# 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцый

### Уводзіны

Змест і месца дысцыпліны «Тэорыя і практыка экскурсійнай работы» ў сістэме падрыхтоўкі па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Мэты і задачы курса. Агляд літаратуры па курсе.

Структура курса. Характарыстыка раздзелаў.

Формы і метады аўдыторнай работы. Формы кантролю.

### Раздзел I. Асновы экскурсійнай работы

#### Тэма 1. Асноўныя этапы развіцця экскурсійнай дзейнасці

Асноўныя этапы развіцця экскурсійнай дзейнасці: дарэвалюцыйны, савецкі, постсавецкі.

Дарэвалюцыйны этап. Зараджэнне экскурсійнай дзейнасці. Цесная ўзаемасувязь экскурсійнай і адукацыйнай дзейнасці. Вучэбныя і школьныя экскурсіі. Стварэнне і дзейнасць першых экскурсійных устаноў. Першыя выданні па экскурсійнай дзейнасці.

Савецкі этап. Станаўленне савецкай экскурсійнай справы. Асноўныя перыяды: 1917–1930; 1930–1945; 1945–1980. Характарыстыка асноўных перыядаў савецкага этапу. Вядомыя педагогі і метадысты экскурсійнай справы, іх роля ў развіцці тэорыі і практыкі экскурсійнай работы. Узаемасувязь развіцця экскурсійнай справы і краязнаўчага руху. Роля краязнаўчых арганізацый. Роля прафсаюзаў у развіцці экскурсійнай справы. Развіццё сеткі турыстычна-экскурсійных устаноў. Пашырэнне тэматыкі экскурсій. Роля экскурсій у пасляваенныя гады, іх тэматычная накіраванасць. Дыферэнцыраваны падыход у экскурсійным абслугоўванні. Развіццё тэорыі і методыкі экскурсійнай дзейнасці.

Постсавецкі этап. Крызіс у развіцці экскурсійнай справы.

Станаўленне экскурсійнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь. Увага дзяржавы да праблем турыстычна-экскурсійнай дзейнасці. Дакументы, якія рэгулююць турыстычна-экскурсійную дзейнасць у Рэспубліцы Беларусь.

#### Тэма 2. Экскурсія і яе сутнасць

Розныя падыходы да вызначэння экскурсіі. Экскурсія як від дзейнасці. Экскурсія як форма зносін. Асноўныя функцыі экскурсіі. Прыкметы экскурсіі:

працягласць у часе; наяўнасць экскурсійнай групы і экскурсавода; паказ экскурсійных аб’ектаў, першаснасць зрокавага ўспрымання; падпарадкаванне паказу аб’ектаў вызначанай тэматыцы. Патрабаванні да экскурсіі: паўната і дакладнасць матэрыялу, цэласнасць і завершанасць кампазіцыі, задавальненне запатрабаванняў экскурсантаў і інш.

### Тэма 3. Класіфікацыя экскурсій

Агульныя прынцыпы класіфікацыі.

Класіфікацыя экскурсій па змесце.

Класіфікацыя па складзе ўдзельнікаў экскурсійнай групы.

Класіфікацыя па месцы правядзення экскурсіі.

Класіфікацыя па спосабе руху.

Класіфікацыя па форме правядзення.

Значэнне класіфікацыі. Выкарыстанне класіфікацыйных прыкмет пры арганізацыі і правядзенні экскурсій.

### Тэма 4. Тэхналогія падрыхтоўкі экскурсіі

Асноўныя этапы падрыхтоўкі экскурсіі, іх паслядоўнасць і ўзаемасувязь.

Вызначэнне мэт і задач экскурсіі. Выбар тэмы і назвы экскурсіі. Адбор літаратуры і складанне бібліяграфіі. Вызначэнне іншых крыніц экскурсійнага матэрыялу: вывучэнне архіўных матэрыялаў, азнаямленне з экспазіцыямі і фондамі музеяў.

Адбор і вывучэнне экскурсійных аб’ектаў. Класіфікацыя аб’ектаў паказу. Крытэрыі адбору аб’ектаў паказу. Складанне картак экскурсійных аб’ектаў.

Складанне маршруту экскурсіі. Абход (аб’езд) маршруту экскурсіі.

Падрыхтоўка тэксту экскурсіі. Патрабаванні да тэксту экскурсіі. Кантрольны і індывідуальны тэкст экскурсіі.

Камплектаванне «партфеля экскурсавода», яго змест і прызначэнне.

Вызначэнне метадычных прыёмаў і тэхнікі правядзення экскурсіі.

Складанне тэхналагічнай карты (метадычнай распрацоўкі) экскурсіі. Структура і афармленне тэхналагічнай карты.

Складанне індывідуальнага тэксту экскурсіі.

Прыём і зацвярджэнне экскурсіі. Правядзенне пробнай экскурсіі.

Падрыхтоўка экскурсавода да правядзення распрацаванай экскурсіі.

## Тэма 5. Методыка правядзення экскурсіі

Экскурсійная методыка, яе патрабаванні. Тэматычная адпаведнасць экскурсійных аб'ектаў. Лагічная паслядоўнасць паказу аб'ектаў, лагічныя пераходы. Бесперапыннасць экскурсіі. Прынцыпы ўзаемадзеяння паказу і расказу. Цэласнасць экскурсіі.

Метадычныя прыёмы правядзення экскурсіі. Паказ і расказ.

Экскурсійны паказ аб'ектаў. Метадычныя прыёмы паказу: папярэдні агляд, экскурсійны аналіз, зрокавая рэканструкцыя, лакалізацыя падзей, зрокавае параўнанне і інш. Метадычныя прыёмы паказу наглядных дапаможнікаў. Сродкі паказу экскурсійных аб'ектаў.

Экскурсійны расказ. Асноўныя патрабаванні да экскурсійнага расказу: тэматычная накіраванасць, дакладнасць, лаканічнасць, даступнасць і інш. Метадычныя прыёмы расказу: экскурсійная даведка, апісанне, тлумачэнне, каментарый, цытаванне, літаратурны мантаж.

Асаблівыя прыёмы правядзення экскурсіі: сустрэча з цікавымі людзьмі, выкарыстанне элементаў рытуалу, актывізацыя пазнавальнай дзейнасці экскурсантаў і інш.

## Тэма 6. Тэхніка правядзення экскурсіі

Асноўныя патрабаванні да тэхнікі правядзення экскурсіі. Знаёмства экскурсавода з групай. Перамяшчэнне экскурсантаў. Тэмп руху. Размяшчэнне экскурсійнай групы і экскурсавода пры паказе аб'екта. Час правядзення экскурсіі, неабходнасць захавання рэгламенту. Асаблівасці правядзення транспартнай экскурсіі. Пытанні экскурсантаў. Паўзы падчас экскурсіі. Тэхнічныя сродкі забеспячэння экскурсійнага працэсу. Працягласць экскурсіі. Патрабаванні да маршруту экскурсіі. Уздзеянне на экскурсійны працэс знешніх фактараў.

## Тэма 7. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення розных відаў экскурсій

Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення аглядных шматпланавых экскурсій.

Тэматычныя экскурсіі (гістарычныя, архітэктурна-горадабудаўнічыя, мастацтвазнаўчыя, літаратурныя, прыродазнаўчыя і інш.), асаблівасці іх падрыхтоўкі і правядзення.

Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення вытворчых, загарадных экскурсій.

Музейныя экскурсіі, іх сутнасць, спецыфіка, асаблівасці правядзення. Экскурсіі ў музеях-сядзібах і музеях-запаведніках.

Камбініраваныя экскурсіі.

## Раздзел II. Асноўныя кірункі ўдасканалення экскурсійнай дзейнасці

### Тэма 8. Прафесійныя і асабістыя якасці экскурсавода

Асаблівасці прафесіі экскурсавода. Асоба экскурсавода: задаткі і здольнасці, характар і тэмперамент. Прафесійнае майстэрства экскурсавода. Мова экскурсавода. Культура і тэхніка мовы. Стыль паводзін і манеры экскурсавода.

Удасканаленне прафесійнага майстэрства экскурсавода. Самаадукацыя. Спецыялізацыя.

### Тэма 9. Арганізацыя і змест работы экскурсавода

Арганізацыя работы экскурсавода. Планаванне работы, асноўныя службовыя абавязкі экскурсавода. Кантроль за работай экскурсавода. Падбор кадраў. Падрыхтоўка экскурсаводаў.

### Тэма 10. Дыферэнцыраваны падыход да экскурсійнага абслугоўвання

Паняцце экскурсійнага абслугоўвання. Экскурсія як паслуга. Якасць і культура абслугоўвання.

Сутнасць дыферэнцыраванага падыходу да экскурсійнага абслугоўвання. Экскурсійная аўдыторыя. Дыферэнцыяцыя экскурсантаў. Віды фарміравання экскурсійных груп.

Падрыхтоўка і правядзенне экскурсій з улікам запатрабаванняў, інтарэсаў, узроўню падрыхтоўкі і іншых асаблівасцей экскурсантаў. Стварэнне некалькіх варыянтаў экскурсіі на адну тэму для розных экскурсійных груп.

Спецыфіка падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій для дзяцей, моладзі, дарослых.

Асаблівасці падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій для замежных турыстаў.

Спецыфіка падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій для людзей з псіхафізічнымі асаблівасцямі.

Арганізацыя індывідуальнага экскурсійнага абслугоўвання.

Вывучэнне попыту ў галіне экскурсійнага абслугоўвання.

## Тэма 11. Спецыфіка арганізацыі і планавання экскурсійнай работы ў музеі

Экскурсія як асноўная форма культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Арганізацыя экскурсійнай работы ў музеі. Структурныя падраздзяленні музея, якія займаюцца арганізацыяй і правядзеннем экскурсій. Узаемадзеянне музея і турыстычных фірм. Уключэнне музеяў у турыстычныя маршруты.

## Тэма 12. Экскурсійная работа ў турызме

Арганізацыя экскурсійнай работы ў турыстычна-экскурсійных установах. Арганізатары экскурсій, кіраўнікі турысцкіх груп, экскурсаводы (гіды).

Метадычная работа. Комплексны падыход да стварэння турысцка-экскурсійнага прадукту.

# 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

Семінарскія заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да сварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэфератаў, выкананне пісьмовых заданняў па асобных раздзелах дысцыпліны (складанне карткі аб’екта паказу, запаўненне карткі праслухоўвання экскурсіі), вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме, творчыя заданні ў ходзе самастойнай кіруемай работы студэнтаў (стварэнне электронных прэзентацый, відэаэкскурсій і інш.).

### Семінарскія заняткі 1
### Экскурсія і яе сутнасць

1. Асноўныя падыходы да вызначэння экскурсіі.
2. Асноўныя функцыі экскурсіі.
3. Прыкметы экскурсіі.
4. Патрабаванні да экскурсіі.

Літаратура:

1. Савина, Н.В. Экскурсоведение : учеб.-практ. пособие / Н.В. Савина. – Минск : БГЭУ, 2007. – 246 с.
2. Худницкая, Е.В. Экскурсоведение : учебное пособие / Е.В. Худницкая. – Минск : РИВШ, 2021. – 346 с.
3. Чирский, Н.А. Экскурсоведение. Основы экскурсионной деятельности / Н.А. Чирский. – 3-е изд. – Минск : РИВШ, 2019. – 283 с.

### Семінарскія заняткі 2
### Класіфікацыя экскурсій

1. Класіфікацыя экскурсій па змесце.
2. Класіфікацыя па складзе ўдзельнікаў экскурсійнай групы.
3. Класіфікацыя па месцы правядзення экскурсіі.
4. Класіфікацыя па спосабе руху.
5. Класіфікацыя па форме правядзення.
6. Інавацыйныя формы экскурсій (агляд айчынных і замежных прапаноў паводле інтэрнэт-крыніц).

Літаратура:

1. Емельянов, Б.В. Экскурсоведение : учебник / Б.В. Емельянов. – М. : Сов. спорт, 2000. – 215 с.

2. Савина, Н.В. Экскурсоведение : учеб.-практ. пособие / Н.В. Савина. – Минск : БГЭУ, 2007. – 246 с.

3. Худницкая, Е.В. Экскурсоведение : учебное пособие / Е.В. Худницкая. – Минск : РИВШ, 2021. – 346 с.

4. Чирский, Н.А. Экскурсоведение. Основы экскурсионной деятельности / Н.А. Чирский. – 3-е изд. – Минск : РИВШ, 2019. – 283 с.

## Семінарскія заняткі 3
## Тэхналогія падрыхтоўкі экскурсіі

Семінар праходзіць у аўдыторыі ў форме завочнай экскурсіі (відэаэкскурсіі). Кожная група (3–5 чал.) рыхтуе экскурсію па сваёй тэматыцы (адпаведна асноўным тэхналагічным этапам), суправаджае яе відэарадам. Працягласць відэаэкскурсіі – 15 хвілін.

Прыкладныя тэмы для відэаэкскурсій:

1. Плошча Незалежнасці.
2. Кастрычніцкая плошча і Аляксандраўскі сквер.
3. Вузы г.Мінска.
4. БДУ культуры і мастацтваў.
5. Паркі і сады г.Мінска.
6. Гісторыя пр-та Незалежнасці.
7. Траецкае прадмесце.
8. Мінск спартыўны.
9. Мінск навуковы.
10. Мінск тэатральны.
11. Іншая тэма па выбары студэнтаў.

Альтэрнатыўны варыянт правядзення семінара – у выглядзе вучэбнай экскурсіі па БДУКМ, гарадской вучэбнай экскурсіі, загараднай экскурсіі.

## Семінарскія заняткі 4, 5
## Методыка правядзення экскурсіі

Семінары праходзяць у выглядзе выязных практычных заняткаў у музейных установах г.Мінска.

*Заданне.* Праслухаць экскурсію ў адной з музейных устаноў г. Мінска і запоўніць картку праслухоўвання. Правесці абмеркаванне экскурсіі (змест, тэхніка правядзення, культура мовы, недахопы і інш.).

*Картка праслухоўвання экскурсіі (узор)*

Назва экскурсіі.

Від экскурсіі.

Працягласць экскурсіі.

Змест экскурсіі: адпаведнасць пастаўленай мэце, напоўненасць экскурсіі, абагульненні па падтэмах і інш.

Методыка правядзення экскурсіі: структура экскурсіі, размеркаванне часу па падтэмах, кантакт экскурсавода з групай, лагічныя пераходы, метадычныя прыёмы паказу і расказу, наглядныя матэрыялы з «партфеля экскурсавода», якія былі выкарыстаны на экскурсіі.

Тэхніка правядзення экскурсіі: выбар месца для агляду, размяшчэнне групы, адказы на пытанні і інш.

Культура мовы экскурсавода: дакладнасць, лагічнасць, вобразнасць, эмацыянальнасць і г.д.

Вынікі праслухоўвання, парады экскурсаводу.

Прозвішча, імя студэнта, які склаў картку.

## Семінарскія заняткі 6
## Тэхніка правядзення экскурсіі

1. Асноўныя патрабаванні да тэхнікі правядзення экскурсіі.
2. Узаемазносіны экскурсавода з групай падчас экскурсіі.
3. Асаблівасці тэхнікі правядзення транспартнай экскурсіі.
4. Тэхнічныя сродкі забеспячэння экскурсійнага працэсу.
5. Працягласць і маршрут экскурсіі.
6. Уздзеянне на экскурсійны працэс знешніх фактараў.

Літаратура:


1. Емельянов, Б.В. Экскурсоведение : учебник / Б.В. Емельянов. – М. : Сов. спорт, 2000. – 215 с.
2. Савина, Н.В. Экскурсоведение : учеб.-практ. пособие / Н.В. Савина. – Минск : БГЭУ, 2007. – 246 с.
3. Худницкая, Е.В. Экскурсоведение : учебное пособие / Е.В. Худницкая. – Минск : РИВШ, 2021. – 346 с.
4. Чирский, Н.А. Экскурсоведение. Основы экскурсионной деятельности / Н.А. Чирский. – 3-е изд. – Минск : РИВШ, 2019. – 283 с.

Семінарскія заняткі 7

Тэхніка правядзення экскурсіі

Семінар праходзіць у выглядзе практыкума, на якім студэнты замацоўваюць атрыманыя тэарэтычныя веды на практыцы і адпрацоўваюць тэхніку правядзення экскурсіі на экспазіцыі БДУКМ ці ў музеях горада.

Семінарскія заняткі 8

Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення розных відаў экскурсій

1. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення аглядных шматпланавых экскурсій.
2. Тэматычныя экскурсіі (гістарычныя, архітэктурна-горадабудаўнічыя, мастацтвазнаўчыя, літаратурныя, прыродазнаўчыя і інш.), асаблівасці іх падрыхтоўкі і правядзення.
3. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення вытворчых, загарадных экскурсій.
4. Музейныя экскурсіі, іх сутнасць, спецыфіка, асаблівасці правядзення. Экскурсіі ў музеях-сядзібах і музеях-запаведніках.
5. Камбініраваныя экскурсіі.

Літаратура:

1. Савина, Н.В. Экскурсоведение : учеб.-практ. пособие / Н.В. Савина. – Минск : БГЭУ, 2007. – 246 с.
2. Сборник методических рекомендаций / Мин-во спорта и туризма Республики Беларусь, Департамент по туризму Мин-ва спорта и туризма Республики Беларусь, Нац. агентство по туризму. – Минск, 2007. – 307 с.
3. Худницкая, Е.В. Экскурсоведение : учебное пособие / Е.В. Худницкая. – Минск : РИВШ, 2021. – 346 с.

Семінарскія заняткі 9

Дыферынцыраваны падыход да экскурсійнага абслугоўвання

1. Паняцце экскурсійнага абслугоўвання. Экскурсія як паслуга.
2. Сутнасць дыферэнцыраванага падыходу да экскурсійнага абслугоўвання.
3. Дыферэнцыяцыя экскурсантаў. Віды фарміравання экскурсійных груп.
4. Спецыфіка падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій для дзяцей, моладзі, дарослых.

5. Асаблівасці падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення экскурсій для замежных турыстаў. Арганізацыя індывідуальнага экскурсійнага абслугоўвання.

6. Вывучэнне попыту ў галіне экскурсійнага абслугоўвання.

7. Творчае заданне: распрацаваць пуцяводнік па Мінску для розных катэгорый экскурсантаў (дзеці, моладзь, сем'і, спецыялісты ў пэўнай галіне, людзі сталага ўзросту і інш.).

Літаратура:

1. Савина, Н.В. Экскурсоведение : учеб.-практ. пособие / Н.В. Савина. – Минск : БГЭУ, 2007. – 246 с.

2. Сборник методических рекомендаций / Мин-во спорта и туризма Республики Беларусь, Департамент по туризму Мин-ва спорта и туризма Республики Беларусь, Нац. агентство по туризму. – Минск, 2007. – 307 с.

3. Худницкая, Е.В. Экскурсоведение : учебное пособие / Е.В. Худницкая. – Минск : РИВШ, 2021. – 346 с.

4. Чирский, Н.А. Экскурсоведение. Основы экскурсионной деятельности / Н.А. Чирский. – 3-е изд. – Минск : РИВШ, 2019. – 283 с.

Семінарскія заняткі 10

Спецыфіка арганізацыі і планавання экскурсійнай работы ў музеі

1. Экскурсія як асноўная форма культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.

2. Віды і формы музейных экскурсій.

3. Арганізацыя экскурсійнай работы ў музеі.

4. Узаемадзеянне музея і турыстычных фірм.

5. Уключэнне музеяў Беларусі ў турыстычныя маршруты. Прапановы студэнтаў.

Літаратура:

1. Савина, Н.В. Экскурсоведение : учеб.-практ. пособие / Н.В. Савина. – Минск : БГЭУ, 2007. – 246 с.

2. Сборник методических рекомендаций / Мин-во спорта и туризма Республики Беларусь, Департамент по туризму Мин-ва спорта и туризма Республики Беларусь, Нац. агентство по туризму. – Минск, 2007. – 307 с.

3. Худницкая, Е.В. Экскурсоведение : учебное пособие / Е.В. Худницкая. – Минск : РИВШ, 2021. – 346 с.

# 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа разлічана на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Форма выканання работы – складанне тэхналагічнай карты экскурсіі на адну з прапанаваных тэм.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай.

1. Плошча Незалежнасці.
2. Кастрычніцкая плошча і Аляксандраўскі сквер.
3. Вузы г.Мінска.
4. БДУ культуры і мастацтваў.
5. Паркі і сады г.Мінска.
6. Гісторыя пр-та Незалежнасці.
7. Траецкае прадмесце.
8. Мінск спартыўны.
9. Мінск навуковы.
10. Мінск тэатральны.
11. Іншая тэма па выбары студэнтаў.

## 4.2 Пытанні для экзамена

1. Асноўныя этапы развіцця экскурсійнай справы ў Беларусі і Расіі.
2. Вядомыя экскурсіяністы пачатку ХХ ст. і іх уклад у развіццё экскурсійнай тэорыі і практыкі.
3. Экскурсія і яе сутнасць. Асноўныя функцыі, прыкметы і асаблівасці экскурсіі.
4. Класіфікацыя экскурсій. Прынцыпы класіфікацыі.
5. Класіфікацыя экскурсій па зместу. Класіфікацыя экскурсій па форме правядзення.
6. Класіфікацыя экскурсій па месцы правядзення і складу ўдзельнікаў.
7. Асноўныя этапы падрыхтоўкі экскурсіі, іх паслядоўнасць.
8. Тэма, мэты і задачы экскурсіі.
9. Адбор і вывучэнне экскурсійных аб’ектаў. Картка экскурсійнага аб’екта.
10. Патрабаванні да маршрута экскурсіі.

11. Падрыхтоўка тэкста экскурсіі. Кантрольны і індывідуальны тэксты.

12. Камплектаванне “партфеля экскурсавода”, яго змест і прызначэнне.

13. Метадычныя прыёмы правядзення экскурсіі. Паказ і расказ на экскурсіі.

14. Метадычныя прыёмы паказу на экскурсіі.

15. Метадычныя прыёмы расказу на экскурсіі.

16. “Асаблівыя” метадычныя прыёмы правядзення экскурсіі.

17. Тэхніка правядзення экскурсіі.

18. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення аглядных шматпланавых экскурсій.

19. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення тэматычных экскурсій.

20. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення літаратурных экскурсій.

21. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення экскурсій на рэлігійную тэматыку.

22. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення вытворчых экскурсій.

23. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення музейнай экскурсіі.

24. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення архітэктурных экскурсій.

25. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення прыродазнаўчых экскурсій.

26. Арганізацыя і змест работы экскурсавода. Падрыхтоўка экскурсаводаў.

27. Прафесійнае майстэрства экскурсавода. Мова экскурсавода (культура і тэхніка маўлення).

28. Удасканаленне прафесійнага майстэрства экскурсавода.

29. Невербальныя сродкі камунікацыі ў экскурсіі.

30. Экскурсійная аўдыторыя. Дыферэнцыяцыя экскурсантаў.

31. Паняцце экскурсійнага абслугоўвання. Экскурсія як паслуга.

32. Спецыфіка падрыхтоўкі і правядзення экскурсій для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў.

33. Спецыфіка падрыхтоўкі і правядзення экскурсій для падлеткаў.

34. Спецыфіка падрыхтоўкі і правядзення экскурсій для моладзі.

35. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення экскурсій для дарослых.

36. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення экскурсій для сямейных наведвальнікаў.

37. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення экскурсій для замежных турыстаў.

38. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення экскурсій для рознаўзроставых і зборных груп.

39. Спецыфіка арганізацыі і планавання экскурсійнай работы ў музеі.

40. Інавацыйныя формы экскурсій.

41. Экскурсійная работа як адна з асноўных форм арганізацыі культурна-пазнавальнага турызма. Арганізацыя экскурсійнай работы ў турыстычна-экскурсійных прадпрыемствах.

42. Музейны турызм як складнік гісторыка-культурнага турызма.

43. Распрацоўка тэхналагічнай карты экскурсіі. Практычнае заданне.

4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| | |
|---|---|
| 1 (адзін) | адзнака ставіцца, калі студэнт адмовіўся ад адказу ці спроба адказу цалкам не адпавядае зместу прапанаваных студэнту пытанняў або студэнт зусім не валодаем вучэбным матэрыялам. |
| 2 (два) | адзнака ставіцца студэнту, які мае істотныя прабелы ў ведах, не арыентуецца ў спецыялізаваных тэрмінах і паняццях, не валодае асноўнымі паняццямі турыстычнай сферы, не ведае класіфікацыі турызму, не засвоіў большую частку праграмнага матэрыялу, а таксама у выпадку пропускаў і неадпрацоўцы семінарскіх заняткаў, не выкананні заданняў па самастойнай рабоце. |
| 3 (тры) | адзнака ставіцца студэнту, які ведае частку вучэбнага матэрыялу, вельмі слаба аруентуецца ў асноўных турыстычных паняццях, не ведае віды турызму і іх асаблівасці, не вызначыўся актыўнасцю і зацікаўленасцю курсам на семінарскіх занятках, а таксама пры выкананні самастойных і кантрольных работ, няпоўнасцю адпрацаваў практычныя заняткі. |
| 4 (чатыры) | адзнака ставіцца студэнту, які не глыбока валодае асноўным вучэбным матэрыялам, слаба арыентуецца ў асноўных паняццях у турыстычнай галіне, не добра ведае або блытаецца у відах турызму і слаба разумее асноўныя аспекты развіцця турызму ў розных рэгіёнах свету, а таксама не праяўляў актыўнасць на семінарскіх занятках, але атрымаў станоўчую адзнаку за выкананне заданняў па курсе. |

| | |
|---|---|
| 5 (пяць) | заслугоўвае студэнт, які ў асноўным засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, самастойна выконваў заданні, але дапусціў пры іх выкананні памылкі, не вельмі добра валодае праграмным матэрыялам, дапускае не дасканаласці пры выкарыстанні асноўных паняццяў турыстычнай ідустрыі, не добра разбіраецца відах і формах турызму, пры адказе дапускае грубыя памылкі і непоўна раскрывае пытанні, на семінарскіх занятках не праявіў значнай актыўнасці. |
| 6 (шэсць) | заслугоўвае студэнт, які дастаткова ведае вучэбны матэрыял па праграме, завоіў праграмны матэрыял, пры адказе карыстаецца асноўнымі паняццямі і тэрмінамі, ведае класіфікацыю турызму і асаблівасці функцыянавання розных відаў турызму, таксама прымаў удзел у семнарскіх занятках, выканаў неабходныя заданні, атрымаўшы станоўчыя адзнакі, але пры адказе на пытанні дапускае недасканаласці і неістотныя памылкі. |
| 7 (сем) | заслугоўвае студэнт, які трывала і грунтоўна ведае вучэбны матэрыял па праграме, карыстаецца прафесійнай лексікай, добра разбіраеца ў розных аспектах развіцця турызму, валодае ведамі аб фактарах, матывацыі, паслугах у турыстычнай індустрыі, выкарыстоўвае свае веды пад час актыўнага удзелу на семінарскіх занятках, а таксама своечасова выканаў усе заданні і атрымаў добрыя адзнакі, аднак у адказе дапусціў нязначныя памылкі. |
| 8 (восем) | заслугоўвае студэнт, які паказаў веданне вучэбнага матэрыялу па праграме, на пытанні адказвае добра з валоданнем тэрміналогіі і сутнасці пытання, добра разбіраецца ў разнастайных формах і відах турызму, ведае асаблівасці развіцця нацыянальнага турызму, апеліруе фактамі і дадатковай інфармацыяй ў турыстычнай галіне, а таксама пры падрыхтоўцы да заняткаў карыстаўся асноўнай літаратурай, рэкамендаванай у праграме, самастойна і своечасова выканаў усе заданні, праявіў актыўнасць на семінарскіх занятках. |

| | |
|---|---|
| 9 (дзевяць) | заслугоўвае студэнт, які поўна і сістэмна засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, пры адказе дэманструе грунтоўныя веды і веданне матэрыялу, выкарыстоўваючы прыклады і дадатковую інфармацыю пры адказе, разумее асноўныя віды і асаблівасці функцыянавання турыстычнай індустрыі, міжнародныя і нацыянальныя заканадаўчыя акты ў галіне турызма, самастойна і на высокім узроўні выканаў усе віды заданняў па курсу, а таксама актыўна ўдзельнічаў на семінарскіх занятках, карытаўся дадатковымі крыніцамі інфармацыі. |
| 10 (дзесяць) | заслугоўвае студэнт, які поўна, сістэмна і глыбока засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, прадэманстраваў грунтоўныя веды і веданне прафесійнага матэрыялу па тэарытычным аспектам турызму, арыентуецца ў дзейнасці міжнародных турыстычных арганізацый, тэндэнцыях развіцця нацыянальнага і міжнароднага турызму, карыстаўся асноўнай і дадатковай літаратурай пры выкананні самастойных заданняў, а таксама самастойна, своечасова і высокім узроўні выканаў усе заданні, выдатна рыхтаваўся і бліскуча выступаў на семінарскіх занятках. |

# 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| Уводзіны | 1 | | | |
| **Раздзел I. Асновы экскурсійнай работы** | | | | |
| Тэма 1. Асноўныя этапы развіцця экскурсійнай дзейнасці | 1 | | 1 | Вуснае апытанне |
| Тэма 2. Экскурсія і яе сутнасць | 2 | | 1 | Выбарачнае апытанне |
| Тэма 3. Класіфікацыя экскурсій | 2 | | 1 | Выбарачнае апытанне |
| Тэма 4. Тэхналогія падрыхтоўкі экскурсіі | 4 | 2 | 2 | |
| Тэма 5. Методыка правядзення экскурсіі | 6 | 4 | 2 | |
| Тэма 6. Тэхніка правядзення экскурсіі | 2 | 2 | 2 | |
| Тэма 7. Асаблівасці падрыхтоўкі і правядзення розных відаў экскурсій | 4 | 2 | 2 | Падрыхтоўка прэзентацый |
| **Раздзел II. Асноўныя кірункі ўдасканалення экскурсійнай дзейнасці** | | | | |
| Тэма 8. Прафесійныя і асабістыя якасці экскурсавода | 2 | 2 | | Вуснае апытанне, дыскусія |
| Тэма 9. Арганізацыя і змест работы экскурсавода | 2 | 1 | | Выбарачнае апытанне |
| Тэма 10. Дыферэнцыраваны падыход да экскурсійнага абслугоўвання | 2 | 2 | | Вуснае апытанне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Тэма 11. Спецыфіка арганізацыі і планавання экскурсійнай работы ў музеі | 2 | 1 | | Выбарачнае апытанне |
| Тэма 12. Экскурсійная работа ў турызме | 2 | | 1 | Выбарачнае апытанне |
| **Разам:** | **32** | **16** | **12** | |

5.2 Асноўная літаратура

1. Худницкая, Е.В. Экскурсоведение : учебное пособие / Е.В. Худницкая. – Минск : РИВШ, 2021. – 346 с.

2. Чирский, Н.А. Экскурсоведение. Основы экскурсионной деятельности / Н.А. Чирский. – 3-е изд. – Минск : РИВШ, 2019. – 283 с.

5.3 Дадатковая літаратура

1. Гецевич, Н.А. Основы экскурсоведения : учеб. пособие для географических специальностей высших учебных заведений / Н.А. Гецевич. – Минск : Университетское, 1988. – 159 с.

2. Емельянов, Б.В. Экскурсоведение : учебник / Б.В. Емельянов. – М. : Сов. спорт, 2000. – 215 с.

3. Савина, Н. В. Экскурсоведение : учебное пособие. В 2 ч. Ч. 1. – Минск : [б. и.], 2000. – 111 с. .